**Фальклорна-этнаграфічны праект**
**«Мы багатыя тым, што багатую спадчыну маем»**

*Распрацоўшчыкі: Якубец Наталля Іванаўна, педагог дадатковай адукацыі, Вялічка Рэгіна Станіславаўна, кіраўнік народнага гісторыка-краязнаўчага музея Пескаўскай сярэдняй школы Мастоўскага раёна*

**Тэма:** «Мы багатыя тым, што багатую спадчыну маем».
**Працягласць праекта:** доўгатэрміновы.
**Тып праекта:** творчы, з элементамі даследчай дзейнасці.
**Удзельнікі праекта:** навучэнцы 5-9 класаў, настаўнікі, бацькі, жыхары аграгарадкоў Струбніца, Пескі.

## Актуальнасць праекта

У цяперашні час вострую актуальнасць набываюць пытанні даследавання і аднаўлення фальклорна-этнаграфічных традыцый нашых продкаў.

Бадай, няма нічога іншага, што было б так непасрэдна і арганічна звязана з духоўнасцю чалавека, як этнаграфія і фальклор. Яны скіраваны на нас саміх: хто мы, дзе нашы карані, якія жывілі культурнае дрэва, хто нашы продкі, па якіх законах і традыцыях яны жылі? Задаючы гэтыя пытанні, мы асэнсоўваем свой гістарычны лёс, сваю спадчыну, якую пакінулі нам продкі, параўноўваем нашы дасягненні з культурнымі здабыткамі іншых народаў. Праблемай таксама з’яўляецца ўсведамленне навучэнцамі сваёй ролі ў жыцці мясцовай супольнасці, значэнне іх працы для насельніцтва вёскі, мікрараёна. Жыццё ставіць перад намі шмат праблем, сярод якіх няма амаль ніводнай, што сваімі каранямі так ці інакш не была б звязана з нашым гістарычным мінулым.

**Мэта:** выхаванне ў навучэнцаў 5-9 класаў пачуцця грамадзянскасці, патрыятызму, нацыянальнай самасвядомасці і адказнасці за захаванне гісторыка-культурнай спадчыны праз актыўнае ўключэнне ў вывучэнне гісторыі і культуры малой радзімы.

**Задачы:**

уключыць навучэнцаў у вывучэнне гісторыі і культуры роднага краю на аснове пошуку і збору інфармацыі аб звычаях і традыцыях малой Радзімы;

вывучыць, выкарыстоўваючы навуковую літаратуру і ўспаміны мясцовых жыхароў, асаблівасці правядзення і святкавання абрадаў «Масленіца», «Уваходзіны» і «Багач» ў нашай мясцовасці;

садзейнічаць фарміраванню навыкаў калектыўнай творчасці і развіццю індывідуальных здольнасцей вучняў;

задаволіць пазнавальныя інтарэсы ўсіх тых, хто цікавіцца каштоўнай інфармацыяй з мінулых часоў аб родных мясцінах малой Бацькаўшчыны.

Установы і арганізацыі, ва ўзаемадзеянні з якімі выконваецца праект:

адміністрацыя ДУА «Пескаўская сярэдняя школа Мастоўскага раёна»;

Савет народнага гісторыка-краязнаўчага музея школы;

установа культуры «Мастоўскі дзяржаўны музей «Лес і чалавек»;

сельскі клуб «Пескі»;

«Струбніцкі цэнтр вольнага часу і культуры».

## Этапы рэалізацыі праекта

**1.Арганізацыйна-падрыхтоўчы.**

Абгрунтаванне актуальнасці тэмы, матывацыя яе выбару; вызначэнне мэты і задач праекта; падбор літаратуры, атрыбутаў; абмеркаванне з бацькамі дзяцей пытанняў, звязаных з рэалізацыяй праекта; складанне тэматычнага планавання мерапрыемстваў.

**2.Асноўны.**

Дзейнасць з дзецьмі ў адпаведнасці з тэматычным планаваннем, праграмай інавацыйнай дзейнасці.

**3.Заключны.**

Абагульненне вынікаў працы; аналіз дзейнасці; прэзентацыя вынікаў працы.

**Метады і прыёмы работы:** аналітычна-пошукавы, аналіз краязнаўчых крыніц інфармацыі; асабістыя сустрэчы і гутаркі; апытванне, назіранне, лагічны аналіз, метад абагульнення вынікаў.

**Формы прадстаўлення вынікаў праекта:** падрыхтоўка і правядзенне ва ўстанове адукацыі тэатралізаваных прадстаўленняў беларускіх народных абрадаў «Гуканне вясны», «Уваходзіны».

**Чакаемыя вынікі:**

1. Навучэнцы праявяць творчасць, цікавасць да набыцця гістарычных, краязнаўчых і этнаграфічных ведаў, правядуць пошукавую дзейнасць.

2. Будзе сабраны багаты фальклорна-этнаграфічны матэрыял.

3. Навучэнцы паглыбяць веды пра гісторыю народных святаў, вывучаць традыцыі святкавання ў сваёй сям'і.

4. Будзе створана спрыяльная псіхалагічная атмасфера, у якой вучні праявяць свае творчыя здольнасці, акцёрскае майстэрства.

5. Музей установы адукацыі папоўніцца новымі экспанатамі.

**Літаратура**

1. Адраджэнне беларускіх народных традыцый [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: http://www.websmi.by. – Дата доступу: 18.10.2021.

2. Бібліятэка гістарычных артыкулаў. Жыве Беларусь [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: http://tinyurl.com/dxqpzmv. – Дата доступу: 15.11.2021.

3. Даклад. Традыцыі і сучаснасць [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: https://nsportal.ru. – Дата доступу:16.11.2021.

4. Звычаі і традыцыі Беларусі [Электронны рэсурс].– Рэжым доступу: http://probelarus.by. – Дата доступу: 15.11.2021.

5. Краўчанка, А. І. Культуралогія : вучэбны дапаможнік для ВНУ / А. І. Краўчанка. – 3-е выд. – Мінск : Акадэмічны праект, 2001. – 314 с.

6. Катовіч, А. Залатыя правілы народнай культуры / А. Катовіч, Я. Крук. – 2-е выд. – Мінск : Адукацыя і выхаванне, 2008. – 592 с.

7. Library.by. Беларуская лічбавая бібліятэка [Электронны рэсурс] –. Рэжым доступу: http://tinyurl.com/bqjaza9. – Дата доступу: 27.10.2021.

8. Міфалогія беларусаў : энцыкл. слоўн. / склад. І. Клімковіч, В. Аўтушка; навук. рэд. Т. Валодзіна, С. Санько. – Мінск : Беларусь, 2011. – 607 с.

9. Перцаў, В. Н. Дакументы і матэрыялы па гісторыі Беларусі. 3 том / В. Н. Перцаў. – Мінск : Выдавецтва Акадэміі Навук БССР, 1953. – 280 с.

10. Энцыклапедыя электронная [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: http://www.slounik.org/155408.html. – Дата доступу: 01.12.2021.

Дадатак 1

## КАЛЯДЫ. УСПАМІНЫ ДЗЯЦІНСТВА

(Справаздача аб выкананні мерапрыемстваў фальклорна-этнаграфічнага праекта «Мы багатыя тым, што багатую спадчыну маем»)

*Запісана ад жыхаркі аграгарадка*
*Струбніца Мастоўскага раёна*
*Рагацэвіч Саверыны Леанардаўны*
*вучаніцай 8 класа Саўко Дар’яй*

Памятаю са свайго дзяцінства: у нашай вёсцы калядаваць хадзілі 25 снежня. Гэтага вечара чакалі і дарослыя і дзеці, кожны па-свойму.

У той час з намі яшчэ жыла мая бабуля, яна таксама загадзя рыхтавалася да гэтага вечара: складвала манеткі ў маленькую торбачку, адкладвала некалькі рублёў, на той выпадак, калі прыйдуць дарослыя калядоўшчыкі, рыхтавала розныя «смачныя падзякі». Такога багацця цукерак, як цяпер, тады не было, аднак у ход ішло сала, каўбаса, пірагі, яблыкі, арэхі.

Убранні былі самыя розныя: вывернутыя навыварат кажушкі, бабуліныя сарафаны, маміныя спадніцы, шалікі, хусткі, у некаторых былі маскі, мазалі твары сажай з печы. Многія хадзілі з гармонікам.

У гэты вечар дзверы ў хатах не закрывалі, таму што групы калядоўшчыкаў ішлі адны за другімі. Цікава было па голасе, па адзенні, па паводзінах адгадваць, хто прыйшоў. Спявалі песні, прыпеўкі, танцавалі. А былі і такія дзеці, што заходзілі ціхенька і стаялі ля парога і маўчалі. Маўчунам таксама падавалі.

Амаль ва ўсіх дамах калядоўшчыкам падавалі, але былі і такія, дзе адмаўлялі. Тады з іх жартавалі: падпіралі дзверы, каб раніцай гаспадары не маглі выйсці з хаты, раскладалі дровы па дарозе, здымалі вароты, прывязвалі бульбу на вяровачку так, каб яна грукала ў акно.

Я таксама хадзіла калядаваць з малодшым братам і двума суседскімі дзецьмі. Мы далёка не хадзілі, абыходзілі суседзяў, потым з’ядалі прысмакі і дзялілі манеткі.

## КАЛЯДНЫЯ ВАРОЖБЫ

*Запісана ад жыхаркі аграгарадка*
*Струбніца Мастоўскага раёна*
*Дзямідзік Марыі Антонаўны*
*вучаніцай 9 класа*
*Дзямідзік Валерыяй*

Мы, незамужнія дзяўчаты, з вялікім хваляваннем чакалі каляднага вечара. Чакалі цуда. Каму ж з маладых не хацелася б пранікнуць у будучыню, даведацца пра суджанага-раджанага, пра свой сямейны лёс? Для нас варожбы былі забаваю і ўцехаю, бо неслі надзею.

Яшчэ перад тым, як сесці за Вігілійную вячэру, патрэбна было з лыжкай куцці выбегчы на вуліцу і з якога канца вёскі забрэша сабака, адтуль і будзе суджаны. А ўжо ў поўнач мы з сяброўкамі збіраліся разам, садзіліся вакол стала і запальвалі свечку. Самай таямнічай і нават крыху страшнаватай была варожба «на суджанага». Кожная з нас па чарзе

заставалася ў пакоі адна, побач са свечкай ставілі люстэрка і стараліся разгледзець там твар свайго суджанага.

Потым усе беглі на вуліцу, набіралі ў фартух трэсак або бярэмя дроў і беглі ў хату. А ў хаце лічылі трэскі: цотны іх лік – хутка быць у пары, а калі няцотны – у гэтым годзе не сустрэнешся з суджаным.

Кожнай з нас цікава было ведаць, ці раней яна за сваіх сябровак замуж пойдзе. І вось што для гэтага рабілі: скінуўшы чаравік, мералі ім дарогу ад покуці да парога. Чый першы ля парога апынецца, тая напярод замуж пойдзе.

А каб даведацца, якога нораву будзе ваш суджаны, варажылі так: ставілі на стол шэсць талерачак, на кожнай клалі нейкую рэч, накрытую сурвэткаю. Потым кожная дзяўчына па чарзе брала сабе якую-небудзь талерку, і па рэчы мы даведваліся, якога нораву будзе суджаны!

А на талерках ляжалі: чарка (будзе трошачкі выпіваць), люстэрка (прыгажун), зерне (працавіты і старанны),кніга (разумны), шчотка (злосны, з характарам),ключы (гаспадарлівы).

Яшчэ была цікавая варожба з зернем і пярсцёнкамі. На талерку насыпалі зерне, а ў зерне лажылі пярсцёнкі розныя. Кожная дзяўчына брала з талеркі па жмені зерня. І па тым, які пярсцёнак ёй даставаўся, можна было даведацца аб дастатку кавалера. Калі дастаўся залаты пярсцёнак – значыць, сустрэнецца хлопец багаты; срэбны – прыйдзе ў сваты хлопец з сярэднім дастаткам; просты пярсцёнак – сустрэнецца вельмі шчодры хлопец, але не вельмі багаты. Ну а калі ўзяла адно зерне, у гэтым годзе ніякі хлопец не сустрэнецца.

Вельмі весёлая і цікавая варожба была з пеўнікам! Пры дапамозе пеўніка мы даведваліся, якой спецыяльнасці будзе жаніх.Па чарзе кожная падыходзіла да пеўніка і ўважліва сачыла, што ён будзе рабіць. Калі пеўнік проста ходзіў ды паглядаў, то гэта значыла, што дзяўчыне дастанецца муж – аграном. Калі ж певень махаў крыламі, то муж будзе лётчыкам, а калі певень кукарэкае, то ў дзяўчыны будзе муж артыст, калі пеўнік бяжыць – спартсмен, грабе лапай, значыць, муж будзе дырэктар.

Дадатак 2

## АБРАД «СВАТАННЕ»

*Распрацавала на падставе*
*інфармацыі, запісанай*
*ад жыхаркі вёскі*
*Ганчары Мастоўскага раёна*
*Дзямідзік Соф'і Адамаўны*

*(Сялянская хата. Марыля вышывае, маці прадзе, бацька штосьці майструе.)*

*Марыля.* Мамулечка родная, што я сёння за сон бачыла: сокалы прыляцелі, чорны шоўк развярцелі, золата рассыпалі.

*Маці.*Дачушка любая, я твой сон разгадаю: сокалы – сваты твае, чорны шоўк – коскі твае, золата – слёзкі твае.

*Марыля.* Мам, я Янку кахаю.

*Маці.* А можа б ты за Васіля пайшла? Хлопец добры, і капейка водзіцца.

*Марыля.* З ім пажаніцца – лепш утапіцца.

*Бацька.* Я вось што табе скажу: горка рэдзька, ды ядуць, дрэнна замужам – ды ідуць. Бабы каюцца, а дзеўкі замуж збіраюцца.

*Маці.* За Васіля не хочаш, дык можа ты за Грышку Параскіна пайла б? Ён хоць сёння ў сваты!

*Марыля.* Вось прыдумала! Ды я на яго глядзець не хачу. Табе, я бачу, усё адно: хоць свіння лыса, абы грошай міса. Дык ён жа хоць і малады, а ходзіць як гарбаты дзед стары.

*Маці.* Марыля, а Мікола які прыгожы. Ну чым ён табе не падабаецца? Бачу ён даўно на цябе пазірае. Ды і каля нас заўсёды была б, суседзі ж!

*Марыля.* Умелі бацька і маці мяне гадаваці, ды не ўмеюць замуж аддаці. Табе хоць бы за курыцу, але ж на сваю вуліцу.

*Бацька.* А можа яшчэ пагуляеш? Табе ж толькі 18 гадкоў.

*Марыля.* Маўчу, дык пэўна замуж хачу.

*Маці.* Няхай ідзе. На свежую кабету пчолка ляціць, а на старую і чорт не глядзіць.

*Бацька.* Няхай. Няхай паспрабуе свайго хлеба, калі бацькавага не хоча.

*(Чуваць галасы. Нехта ідзе. Адчыняюцца дзверы, уваходзяць сваты з хлебам-соллю, гарэлкай.)*

*Сват.* Мы паляўнічыя. Палявалі куніцу, ды здаецца яна ў ваш бок пабегла.

*Бацька.* У нас наша куніца. Можа, вы двор пераблыталі?

*Хросны маладога.* Не, дарэжэнькія, нам куніца не трэба. Чулі, што ў вас дачка ёсць добрая, прыгожая, гаспыдыня. А ў нас ёсць галубок да вашай галубкі. І прыгожы, і гаваркі, і добры работнік. Дык ці не аб’яднаць нам нашых галубкоў, каб яны разам жылі, дзетак гадавалі, ды нас радавалі?

*Бацька маладога.* Карацей кажучы, хадзілі каля хаты, зайшлі да вас у сваты. *(Усе садзяцца за стол.)*

*Сват.*У нас купец – добры маладзец *(жаніх падымаецца, кланяецца).* А ў вас краса – тавар. Можа як-небудзь старгуемся? Наш хлеб – ваша вадзіца, наш хлапец – ваша дзявіца.

*Маці*. Наша маладая на ўсе рукі ўдалая.

*Сват*. Лён хваляць увосень, а дзеўку замужам. Ну, дык пакажыце нам нявесту. *(Выводзяць старую бабу, жаніх адмаўляецца ад яе.)*

*Маці*. А ці чуеш, Мар'ечка, што ў цябе госці начуюць, твайго бацьку турбуюць, цябе, маладу, таргуюць.

*Баба*. Цераз бор сваткі ехалі,
Чаму хвошчыку не нарвалі,
Свайго Янку не адшаравалі.
Ваш малады як пень гарэлы.
Наша маладзіца як сыр белы.
Ваш малады як засланка,
Наша маладзіца як ластаўка.

*Сват*. Лепш маўчы, старая! Марыля, пойдзеш за Янку?

*Марыля*. Пайду.

*Маці*. Можа, сваточкі, рана ім жаніцца? Маладзенькія зусім!

*Хросны маладога*. Ну чаго, сваццця, заквахтала? Успомні. Як сама маладая была: жні пшанічку прызялененьку, аддай дзеўку маладзеньку. Давай лепш са сватам вып'ем ды абмяркуем, як далей справу весці, калі вяселле гуляць.

Дадатак 3

## БЫТАВЫ АБРАД «СТРУБНІЦКІЯ ПАПРАДУХІ»

*Запісана ад жыхарак*
*аг.Струбніца*
*Мастоўскага раёна Краўцэвіч*
*Дануты Міхайлаўны,*
*Чарніцкай Ванды Чаславаўны,*
*Панюк Алены Сцяпанаўны,*
*Шутовіч Фаіны Кляменцьеўны*
*вучаніцай 11 класа*
*Чарніцкай Ангелінай.*
*Літаратурна апрацаваны*
*Вялічка Р.С.,кіраўніком народнага*
*гісторыка-краязнаўчага музея*

Папрадуха – устарэлае слова і ўстарэлы выраз. У тлумачальным слоўніку адзначана, што гэта:

1. Жанчына, якая займаецца ручным прадзеннем. *Якая папрадуха пры кудзелі, такое палатно ў белі. З нар.*

2. Толькі множны лік (папрадухі, дух). Зборышча, якое наладжвала вясковая моладзь для таго, каб папрасці і павесяліцца. *Дзяўчаты ходзяць днём адна да адной на папрадухі.*

У вёсцы Струбніца, дзе вялося апытванне пажылых людзей, папрадухамі называлі дзявочыя працоўныя вечары. Так як большасць жыхароў вёскі каталікі, то на папрадухі збіраліся ўсе дні, акрамя пятніцы і нядзелі. Часцей усяго на папрадухі збіраліся ў хаце, дзе было больш дзяўчат, або дзе гаспадары былі больш гасціннымі.

Кожная дзяўчына несла з сабою прасніцу альбо калаўрот. Пралі пад наглядам старэйшай жанчыны ў хаце. Гаспадыня хаты, дзе праходзілі папрадухі, дапамагала моладзі, вучыла прасці і ткаць. У больш позні вечар на папрадухі прыходзілі хлопцы, каб пажартаваць, паспяваць і, вядома, прыгледзецца да дзявочай працы. Расходзіліся тады, калі былі напрадзены поўныя шпулі. Пад час папрадух танцы не ладзіліся, так як час супадаў з постам. Адзіны вечар, 30 лістапада, так называемыя запускі перад пачаткам посту, моладзь збіралася не на папрадухі, а на вячоркі з песнямі і танцамі.

Зараз папрадухі – з’ява даўно забытая, няма чаго і няма на чым прасці. Павярнуць гісторыю мы не можам, ды гэта і не патрэбна, але памятаць і захаваць добрыя звычаі і абрады падуласна кожнаму, хто любіць сваю Радзіму і свой край.

## Струбніцкія папрадухі

*Вядучы:*
У сярэдзіне Струбніцы хатка стаяла.
У ёй старэнькая бабка век свой дажывала.
Бабка Стася, хоць старая, была весялуха,
На ўсю вёску слынная папрадуха.
Штовечар да бабкі пры першай знічцы
Спяшаліся дзеўкі і маладзічкі.
І мы, як у казцы, час адматаем
І на струбніцкія папрадухі зараз завітаем.
*1-я папрадуха*
Добры вечар у хату, ці прымеце нас?
Доўгі вечар зімовы, прасці прыйшоў час.
*Бабка*
Праходзьце, сядайце, каму дзе зручней.

Я лямпу пастаўлю, каб свяціла ярчэй.



Фота 1. Удзельнікі абраду «Папрадухі»

*2-я папрадуха*
Як, бабулечка, здароўе? Дзе былі і што пачулі?
*Бабка*
Жыву, дзеткі, дзякуй Богу, а была я ў Ганулі.
А пачула навіну пра адну дурніцу,
Выйшла замуж за старога – душой не радніцца.
Называла «старым чортам» і не паважала.
Усё ж дзіцятка нарадзіла, Васілём назвала.
Вось аднойчы пайшла ў лазню, сына з сабой узяла:
– «Праз гадзіну каб забраў!» – мужу наказала.
Праз гадзіну стук у дзверы чуе маладзіца.
Яна сына за парог – сама далей мыцца.
Неўзабаве муж прыйшоў, каб сына забраці.
Ды няма ўжо каго – чорт забраў у маці.
*3- я папрадуха*
Лепш не будзем успамінаць чорта перад ноччу,
Бо кудзелі пазбівае, ці з дарогі збочыць.
*1-я папрадуха*
Давайце лепей запяём аб чымсьці вясёлым.

Працаваць будзе лягчэй, шпарчэй круціць колы.
Песня «Туман ярам» *(У часе посту спяваліся рэлігійныя песні)*
Словы, музыка народныя
Туман ярам, ярам – даліною. (2 разы)
За туманам нічога не відна. (2 разы)
Толькі відна дуба зелянога. (2 разы)
Пад тым дубам крыніца стаяла. (2 разы)
З той крыніцы дзеўка воду брала. (2 разы)
Ды ўпусціла залато вядзерца. (2 разы)
Засмуціла казакова сэрца. (2 разы) .
А хто ж маё вядзерца дастане, (2 разы)
Той са мною на ручнічку стане. (2 разы)
Адазваўся казак маладзенькі: (2 разы)
А я тваё вядзерца дастану, (2 разы)
Я з табою на ручнічку стану. (2 разы)
*4-я папрадуха*
Ой, Марылька, як прыгожа нітку выцягаеш,
Відаць зразу, што каханка добрага ты маеш.
*Марылька*
Я не ведаю ці добры, але абяцае,
Што пад Коледы сватоў ка мне засылае.
*Бабка*
Добры, добры і прыгожы, а яшчэ рукаты,
Што ні возьме – усё гарыць, ці вілы, ці лапата.
*Дзяўчынка*
І мяне, бабулька Стася, павучыце прасці.
*Бабка*
Ты маленькая яшчэ, напрадзешся, Насця.
Вазьмі лепей ты маток ды зматай клубочкі,
Маме будзе менш работы не да самай ночкі.
А табе на ручнічок, вышывай узоры,
Болей кветак – прыварожыш жаніха з гуморам.
Ой, натупалася з вамі, пара адпачыці.
Толькі ў сенцах хтось гаворыць, трэба адчыніць.
Ну, успомнілі пра хлопцаў, а яны ўжо тут.
Вы праходзьце і сядайце вось у гэты кут.
*1-ы хлопец*
Па дарозе мы ішлі ды ката сустрэлі.
*1-я папрадуха*
Не пускайце хоць у хату – папсуе кудзелі.
*2-я папрадуха*

Ой, чаму гэта, чаму, шнур штораз злятае?
*3-я папрадуха*
Ці не бачыш, то Міхась прасці памагае.
*2-я папрадуха*
Ты, Міхась лепш кош пляці, па грыбы з чым пойдзеш?
*3-я папрадуха*
Што з кашом, што без каша – усё адно не знойдзеш!
*Міхась ( шэпча на вуха другой дзяўчыне)*
Пачакай, пачакай, грыбоў назбіраю.
Усе табе прынясу, бо цябе кахаю.
*Бабка*
Вы кахайце, то кахайце, ды запамінайце,
Каб не стала, як у песні, а ну, падпявайце.
Песня «Ой, паслала ж мяне маць  яравое жыта жаць»
Ой, паслала ж мяне маць (3 разы)
яравое жыта жаць (2 разы увесь радок).
А я жыта не жала, у баразёнцы ляжала.
Баразёнка вузёнка, я не выспалася.
Тут Мікіта ідзе і арэшкі нясе.
Я не знаю, што рабіць, ці то жаць, ці то любіць.
Буду жыта я жаць і Мікіту цалаваць.
*Маладзіца*
Дзеці, хопіць замінаць, бяжыце да печы,
Пасядзіце каля бабкі ды пагрэйце плечы.
*Дзяўчынка*
Бабка Стася, напячы птушак, калі ласка,
І сягодня раскажы пра зайчыка казку.
*Бабка*
Не, міленькіе мае, казкі дзісь не будзе,
Раскажу я вам легенду, што казалі людзі.
Сярод поля быў грудочак, а на тым грудочку
Ляжаў камень, як стол гладкі, а на ім слядочкі.
Іх на камені пакінуў сам Святы Антоні,
Калі Божае Дзіцятка хаваў ад пагоні.
Доўга людзі абміналі гэты камень, дзеткі,
І надумалі сцягнуць са свайго палетку.
Два валы яны запрэглі, каб яго сцягнуці,
Не змаглі валы той камень з месца зварухнуці.
Тады людзі зразумелі, што камень – знак Божы
І касцёл пабудавалі светлы і прыгожы.
Пры касцёле камень той ляжыць ля ўваходу,

А вада, што ў слядках, лечыць шмат народу.
Ну, усё, жэўжыкі мае, пара памаліцца,
І залазьце на печ, трэба спаць лажыцца.
*2-я папрадуха*
Ну, бабулечка, і мы шпулі панапралі.
Калаўроткі тут паставім, каб не замiналі.
*1-я папрадуха*
Ну, а прасніцы з сабой панясём дадому.
Заўтра прыйдзем ізноў мы да вас, вядома.
*Бабка*
Вы прыходзьце раней, даўжэй пасядзіце.
Хлопцы, прасніцы нясці дзяўчатам памажыце.
*Хлопец*
Ну, бывайце, бабка Стася, дзякуем за хату
І жадаем, каб у ёй усяго было багата.
*Вядучы*
А мы дзякуем усім бабкам-маладухам,
Што ўспомнілі яны абрад «Папрадухі».